

Нядаўна ў Салігорску пабываў Герой Савецкага Саюза Міхаіл Пятровіч Дзевятаеў, той самы савецкі лётчык, які ў гады мінулай вайны ўцёк з фашысцкага палону на варожым самалёце. Міхаіл Пятровіч з вялікай цікавасцю знаёміўся з Салігорскам, выступіў перад шахцёрамі і будаўнікамі, наведаў вучняў школ.

Усюды, дзе б ні з'яўляўся праслаўлены лётчык, яму аказваліся цёплыя і сардэчныя сустрэчы. Затым Міхаіл Пятровіч наведаў Брэст.

НА ЗДЫМКУ: Міхаіл Пятровіч Дзевятаеў (злева) выступае ў Брэсцкай студыі тэлебачання. Справа старшы рэдактар тэлевізійных навін Віктар Герасімавіч Міхнюк.

**Фота В. Германа.**
**Фотахроніка БЕЛТА.**